http://edoc.bseu.by

# ПРАВАВЫ СТАН ЖАНЧЫНЫ Ў СТАТУТОВЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ

В. В. Сідарэнка

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Гісторыя прававога рэгулявання стану жанчыны сыходзіць сваімі каранямі ў глыбіню стагоддзяў. На працягу ўсяго Сярэднявечча месца жанчыны ў грамадстве дыктавалася біблейскай традыцыяй, патрыманіяльнай дзяржаўнай сістэмай і высокай ступенню патрыярхальнага ўкладу ўнутры сям'і. Звычаёвае права, першасна рэгуляваўшае ў грамадстве статус розных груп насельніцтва, паступова саступала месца пісанаму праву. З прыходам у XVI ст. на землі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) статутовага заканадаўства з'яуляецца ўсё больш палажэнняў, якія абмяжоўваюць або скасоўваюць патрырхальны ўклад.

У Статуце 1529 г. немалая ўвага надаецца правам жанчын, апісваюцца правы і абавязкі, якія маюць жонкі і дочкі ў сям'і. У першую чаргу вызначаецца ўзрост наступлення паўналецця, які для дзяўчат складае пятнаццаць гадоў (р. 1, арт. 19). У Статуце 1566 г. шлюбны ўзрост надыходзіць таксама з 15 гадоў. У Статуце ж 1588 г. гэты ўзрост змяншаецца да 13 гадоў. Для юнакоў ўзрост паўналецця ва ўсіх рэдакцыях Статута ВКЛ быў адзіным і складаў 18 гадоў.

Статуты зафіксавалі шэраг нормаў, якія тычыліся апякунства, маёмасных правоў жанчын. У крыніцах сустракаецца шэраг цікавых юрыдычных казусаў, звязаных са спадчынай. Напрыклад, дароўная Яна Якубавіча Мантаўта-Коблінскага ад 22 жніўня 1547 г., у якой ён аддае сваёй malaлетняй дачцэ маёнтак [1, с. 93]. Досыць цікавыя яго матывы, – дадзеным учынкам дарыльнік імкнецца загладзіць сваю віну за парушэнне абяцання хрысціць дачку ў праваслаўную веру. Асобна пазначаецца, што гэтая ўласнасць не адмяняе права дачкі на атрыманне сваёй часткі спадчыны-пасагу.

У перыяд ВКЛ права пераемнасці не было роўным, вялікую ролю адыгрываў статус шлюбу, у якім вага меркавання бацькоў іграла адну з наймацнейшых роляў. Згодна са Статутам 1529 г., правы дзяўчат на выбар будучага мужа былі вельмі абмежаванымі: без ухвалення бацькоў дачка не магла выйсці замуж, у адваротным выпадку яна пазбаўлялася свайго маёнтка (р. 4, арт. 10), пры гэтым ніхто не меў права выдаваць дзяўчыну замуж без яе згоды (р. 4, арт. 15).

Іерархія дазволу дзяўчыне выходзіць замуж складалася з некалькіх звёнаў: на чале стаялі бацькі, першарадна бацька, затым дзядзька па бацькоўскай лініі і яе браты, толькі потым, пры асаблівых умовах, – сваякі па іншай лініі і ўлады, якія таксама мелі права даваць дазвол на шлюб. У многім тут прасочваецца пераемнасць пакаленняў, – класічная рыса Сярэднявечча, а таксама патрыярхальны характар сям'і. Разам з гэтым дзяўчаты, якія ўзялі першы шлюб, мелі права атрымаць ад мужа вена, якому надавалася вельмі вялікае значэнне. Ад

яго наяўнасці залежала сацыяльна-эканамічнае становішча жанчыны і яе гарантыі.

Вена – выкуп за нявесту ў часы ВКЛ, які прадстаўляе з сябе плату грашыма або маёмасцю, якую жаніх уносіў бацькам або сваякам дзяўчыны. У помніках польскага і літоўска-рускага права пасаг, які прыносіўся нявестай, называўся прысак, венам жа з'яўлялася тая сума, якую муж запісваў на сваю маёмасць у забеспячэнне пасагу жонкі. Калі мэтай шлюбу было нараджэнне дзяцей, то маёмасць заставалася назаўжды ў распараджэнні сям'і: ішла ў спадчыну дзецям, падобна маёмасці мужа.

У Другім Статуце інстытут вена і пасагу атрымлівае далейшае развіццё. Па-першае, артыкулы пераносяцца ў пачатак раздзела (р. 5, арт. 2), што можа сведчыць аб падвышэнні ўвагі да дадзенага пытання. Па-другое, у пятым раздзеле вызначаўся памер вена, які залежыў ад некалькіх момантаў: вена павінна было мець кошт, роўны кошту двух пасагаў, але быць не большым, чым адна трэць ад усіх маёнткаў мужа.

У Статуце 1588 г. гэтае пытанне раскрываецца яшчэ больш падрабязна. Асноўныя палажэнні, такія як магчымасць патрабавання запісу вена, яго памер адносна ўласнасці мужа, парадак афармлення і немагчымасць мужчыны самастойна распараджацца гэтай часткай зямель застаюцца ранейшымі. З'яўляюцца наступныя тлумачэнні:

1) падваенню кошту пасагу падлягае толькі тая яго частка, якая складаецца з грошай, золата, срэбра, жэмчугу, каштоўных камянёў;

2) апісанне сітуацыі, калі адна трэць маёмасці мужа менш, чым належным чынам падвоены памер пасагу. У такім выпадку бацька ці іншыя сваякі і апекуны дзяўчыны могуць купіць на свае грошы маёнтак і аддаць яго нявесце;

3) развіццё атрымлівае і парадак выкарыстання вянаванай уласнасці мужам і жонкай. Так, калі муж прычыняе якія-небудзь «крыўды» з маёнтка, які знаходзіцца ў жонкі, то менавіта ён павінен адказваць за гэта перад судом і выплочваць кампенсацыю і штрафы са сваіх маёнткаў ці іншай уласнасці.

Сям'я ў перыяд Сярэднявечча была выключна патрыярхальнай, акрамя выпадкаў, калі бацька быў пры смерці ці з'яўляўся недзеяздольным. Голас бацькі меў найбольшую сілу і быў вырашальным. Дзядзька па бацькоўскай лініі і браты мелі права вырашаць лёс непаўналетняй дзяўчыны пры ўмове страты абодвух бацькоў. Пры адмове з боку дзядзькі па бацькоўскай лініі і братоў у адносінах да паўналетняй дзяўчыны, яна мела права звярнуцца да іншых сваіх сваякоў або ўладаў, для атрымання адабрэння.

Нягледзячы на патрыярхальны ўклад сямейнага жыцця, жанчыны ў XVI ст. актыўна займаліся сямейнай гаспадаркай, маглі абараняць у судзе свае эканамічныя інтарэсы: справы аб збеглых сялянах, скаргі аб прысваенні сабе чужой маёмасці, атрыманне лістоў аб абароне маёнтка. Па-першае, для звароту ў суд жанчынам не трэба было прыцягваць іншых асоб, яны маглі самі прадстаўляць свае інтарэсы. Па-другое, згодна са Статутам 1566 г., жанчына магла складаць такія дакументы, як тэстамент, дароўныя запісы, дагаворы аб шлюбе (для дзяцей), «разводныя лісты». Не абмежавана яна была і ў здзяйсненні

здзелак па куплі-продажы маёмасці, закладу, грашовым аперацыям (р. 2, арт. 8; р. 7, арт. 7; р. 1, арт. 21).

Факт вядзення актыўнай ваеннай палітыкі таксама паўплываў на прававое становішча жанчыны. Згодна з Першым Статутам ВКЛ, удовы абавязаны былі несці воінскія павіннасці. Жанчыны ВКЛ самастойна выстаўлялі коней і слуг са сваіх маёнткаў (р. 2, арт. 1). У рэестры «пошт паніцкіх» такіх выпадкаў няшмат, але ўсё ж у гэтым можна ўбачыць заканамернасць, а не адзінкавыя сітуацыі. Напрыклад, у дакументах за май – чэрвень 1563 г. з 43 запісаў 9 кажуць аб тым, што панны самастойна неслі гэтую грамадскую павіннасць [2, с. 155].

Права спадчыны і пытанні апекі адносіліся да грамадзянскіх праваадносін, аднак у статутах надавалася асобная ўвага і крымінальнаму праву. У Статуце 1529 г. (р. 7) у поўнай меры абараняліся правы ахвяр гвалту, незалежна ад іх сацыяльнага статусу, што было значным прагрэсам для права таго часу, бо ў перыяд Сярэднявечча на тэрыторыі Еўропы прыналежнасць да канфесіі і сацыяльны статус вызначалі ступень і форму пакарання. Па Статуту 1566 г., пры ўчыненні мужчынам крымінальных злачынстваў, напрыклад крадзяжу, жанчына і дзеці адказвалі сваёй маёмасцю па такіх справах, узбуджаных супраць іх сваякоў, толькі калі будзе даказана, што яны ў іх удзельнічалі (р. 1, арт. 6).

Князь не меў права караць жонку за мужа, мужчына не меў права распараджацца жыццём жанчыны. Культ мужчыны ўплываў не толькі на грамадзянскае права. Дочкі мелі права спаганяць галаўшчызну (штраф за галаву забітага чалавека на карысць яго сваякоў) толькі пры ўмове адсутнасці братоў, калі ж у сям’і не было дачок і сыноў, тады галаўшчызну спаганялі сваякі.

Ва ўсіх трох рэдакцыях Статута прысутнічае артыкул аб адказнасці за згвалтаванне і ўмовы яго доказу. У якасці пацверджання ўчынення злачынства жанчыне дастаткова было паказаць яго сляды, прыцягнуць двух або трох сведкаў у суд і прынесці прысягу (Статут 1588 г., р. 2, арт. 12).

Праблема шлюбу без згоды бацькоў ў крымінальным праве таксама атрымлівае сваё развіццё. Заканадаўства абараняла правы гвалтоўна ўзятай за жонку дзяўчыны, шляхам яе выкрадання. У такім выпадку, Статутам 1529 г. прадугледжвалася наступнае:

1) калі дзяўчына звяртаецца са скаргай да князя або любога ўрада, то яна прызнаецца ахвярай. Гвалтаўніка караюць смяротным пакараннем, а пацярпелая атрымлівае адну трэць з яго маёнткаў;

2) калі ж дзяўчына маўчыць і не выказвае нязгоду са шлюбам, то прымяняюцца тыя ж палажэнні, што і пры самавольным выхадзе замуж без дазволу бацькоў (р. 7, арт. 6).

Пакаранне ў выпадку ўстанаўлення злачынства самае суровае – пакаранне смерцю, аднак пацярпелая можа пажадаць выйсці замуж за злачынцу. Характэрна, што дадзены артыкул адносіцца да ўсіх жанчын, незалежна ад іх саслоўнай прыналежнасці.

Статутны перыяд у праве ВКЛ можна ахарактарызаваць як прагрэсіўны этап пераходу да пісьмовага заканадаўства, якое замяніла звычай на закон, што надаў жанчынам уласныя правы, якія закраналі розныя сферы грамадскага

жыцця. Шэраг палажэнняў меў вельмі прагрэсіўны характар, якога іншыя краіны Еўропы змаглі дасягнуць толькі праз дзясяцігоддзі.

У крымінальным праве актыўнае развіццё атрымала пытанне аб абароне гонару і годнасці жанчыны пры замаху не толькі на яе гонар, але і на асабісты выбар. Для сярэднявечнай дзяржавы XVI ст. гэта быў сур'ёзны прарыў. На працягу стварэння Статутаў 1566 і 1588 г. пералік грамадзянскіх і эканамічных правоў жанчын дастаткова моцна павялічыўся: апека, магчымасць здзяйснення здзелак, вырашэнне пытанняў спадчыны. Менавіта да гэтага прыйшла Еўропа праз гады паўстанняў і рэвалюцый, у той час як ВКЛ першапачаткова, з пачаткаў развіцця пісьмовага права пачало надзяляць жанчын асабістымі і маёмаснымі правамі.

Аднак вельмі цяжка адназначна сцвярджаць аб прагрэсіўным развіцці прававого становішча жанчыны, бо з развіццём права і прыходам да статутовага заканадаўства павялічвалася колькасць абмежаванняў і абавязкаў, якіх не было ў звычаёвым праве. Разам з тым некаторыя артыкулы статутаў дазвалялі легальна змагацца з патрыярхальным сямейным укладам і пашыралі праваздольнасць жанчыны як у прыватнай, так і ў публічнай сферы.

**Спіс выкарастанных крыніц:**

1. Валинов, В. К. Акты о брачном праве и семейной жизни в Юго-Западной Руси в XVI – XVII стст. / В. К. Валинов. – Киев : Типография императорского университета Св. Владимира, 1909. – 857 с.

2. Пелипенко, Т. И. Положение шляхтянок в семье и обществе Великого княжества Литовского в раннее Новое время / Т. И. Пелипенко // Вестник СПбГУ. – Санкт-Петербург, 2012. – Вып. 4. – С. 152–157.